*Смолік Аляксандр Іванавіч,*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
загадчык кафедры культуралогіі, доктар культуралогіі, прафесар

## Эвалюцыя сінкрэзісу беларускай культуры

*На працягу стагоддзяў царква адыгрывала значную ролю ў культурным і грамадскім жыцці Беларусі: развіцці адукацыі, музыкі, архітэктуры, пашырэнні кніжнай навукі і пісьменства. Тагачасныя светапоглядныя ўяўленні складалі сінкрэтычнае цэлае, у якім культура ў пэўнай ступені была верай, а вера — культурай.*

*Трансфармацыя старажытнабеларускага і сярэдневяковага сінкрэзісу, якая прывяла да даволі разгалінаванай дыферэнцыяцыі культуры і адпаведных сацыякультурных інстытутаў, дэградацыі адзінай царкоўнасці і крызісу непахіснай веры, распачалася ў перыяд Рэфармацыі, у далейшым падтрымлівалася ідэалогіяй Асветніцтва.*

Рэлігія і яе змены з'яўляюцца базісам кожнага культурнага тыпу і, значыць, культуры як цэлага. У розных этнасаў, у тым ліку і беларусаў, уяўленні аб узнікненні жыцця, космасу, чалавека заўсёды мелі рэлігійныя карані. Быццё ўсведамлялася чалавекам адначасова з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разуменнем таго, што яму дадзена гэта быццё, што яно не першаснае, а яму папярэднічае невядомая нематэрыяльная трансцэндэнтная сіла. Рэлігія з'яўлялася фундзіруючым ядром генезісу культуры. Гісторыка-культурная рэканструкцыя разнастайных культурных тэкстаў, якія існавалі на старажытных беларускіх землях, дазваляе меркаваць, што сінкрэтычным, аморфным сэнсавым ядром беларускай культуры амаль да XV ст. было «культура — вера». Менавіта так можна растлумачыць адсутнасць у гэты перыяд на беларускіх землях развітых пазарэлігійных форм культуры. Мы маем на ўвазе такія яе формы, як пазаканфесійнае мастацтва, свецкая адукацыя, навука, філасофія і г. д. На працягу стагоддзяў царква адыгрывала значную ролю ў культурным і грамадскім жыцці Беларусі: развіцці адукацыі, пашырэнні кніжнай навукі і пісьменства.

Пасля распаўсюджвання і зацвярджэння хрысціянства манапалістам у сферы адукацыі і асветы на Беларусі становіцца царква. Па-за яе межамі адукацыя не існавала і існаваць не магла. Старажытных філосафаў і паэтаў у ёй пацяснілі Свяшчэннае Пісанне і тэксты хрысціянскіх аўтараў. Арганізаванае царквой навучанне сканцэнтравалася галоўным чынам у царкоўных школах — манастырскіх, епіскапскіх і прыходскіх. У XI ст. манастырскія школы былі адкрыты пры епіскапскіх кафедрах у Полацку і Тураве. У наступныя стагоддзі іх колькасць павялічылася: яны існавалі ў Брэсце, Вільні, мястэчках Гайна, Мядзведзічы і інш. Гэтыя школы рыхтавалі пісьменных людзей як для царквы, так і да патрэб дзяржаўнага кіравання. Увядзенне епархій і з'яўленне манастыроў былі ступенямі ў развіцці літаратуры і філасофскай думкі на раннесярэдневяковых беларускіх землях. Казанні, прапаведзі, спавядальныя малітвы, жыціі святых, напісаныя Кірылам Тураўскім, Кліментам Смаляцічам, Аўраміем Смаленскім, Кіпрыянам, Грыгорыем Цамблакам, з'яўляліся ўзорам для беларускіх кніжнікаў і духоўна ўзбагачалі людзей.

Хрысціянства вызначала прынцыпы развіцця архітэктуры, жывапісу, скульптуры, музыкі. Беларускімі дойлідамі гэтага часу ўзведзены ўнікальныя помнікі архітэктуры: Сафійскі сабор у Полацку, гродзенская Барысаглебская царква, Вялікі сабор Бельчыцкага манастыра, вежа ў Камянцы і інш. Жывапіс эпохі сярэднявечча прадстаўлены ў асноўным фрэскавымі роспісамі храмаў, мініяцюрамі, іканапісам. Пластычнае мастацтва абазначанага перыяду таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развівалася пад уплывам хрысціянства. Культавыя функцыі выконвалі крыжы-энкалпіёны, абразкі і іншыя ўпрыгожанні, якія былі шырока распаўсюджаны ў асабістым ужытку. Аналіз форм і зместу мастацкай культуры сведчыць, што ў гэты перыяд на беларускіх землях амаль адсутнічаюць развітыя пазарэлігійныя формы культуры. У адрозненне ад заходнееўрапейскіх краін абазначаныя формы культуры не вылучаліся з культурнага цэлага. Яны імпліцытна прысутнічалі ў рэлігіі і сакралізаваных формах культуры.

Кампаратыўны аналіз працэсу станаўлення і развіцця філасофскай думкі ў Беларусі паказвае, што засваенне навуковых, палітычных і філасофскіх ідэй ажыццяўлялася не рацыянальна, а містычна. Яны не вывучаліся, як гэтага патрабуюць формы сістэматызаваных ведаў, а хутчэй прымаліся на веру, разглядаліся як свайго роду мірскі дадатак да рэлігійнай веры і канфесійнага жыцця. Усе тагачасныя светапоглядныя ўяўленні, якія мелі прамое ці ўскоснае дачыненне да прыродазнаўства, тэхнікі, гуманітарных ведаў і нават да багаслоўя, не вылучаліся як асобныя артэфакты культуры. Не вылучаныя з агульнага кантэксту старажытнабеларускай духоўнай культуры, гэтыя з'явы складалі сінкрэтычнае цэлае, у якім культура ў пэўнай ступені была верай, а вера — культурай.

Трансфармацыя старажытнабеларускага і сярэдневяковага сінкрэзісу, якая прывяла да даволі разгалінаванай дыферэнцыяцыі культуры і адпаведных сацыякультурных інстытутаў, дэградацыі адзінай царкоўнасці і крызісу непахіснай веры, распачалася ў перыяд Рэфармацыі. Каталізатарам культурных мадэрнізацыйных працэсаў, на наш погляд, паслужылі Люблінская і Берасцейская уніі. Лідары рэфармацыйнага руху выступалі з крытыкай сярэдневяковага светапогляду і адстойвалі прынцыпы буржуазнага індывідуалізму. На беларускія землі пранікаюць ідэі заходнееўрапейскага гуманізму, гусіцкай ідэалогіі, вучэнні Ж. Кальвіна, М. Лютэра, Т. Мюнцэра, якія садзейнічалі фарміраванню радыкальнага кірунку беларускай Рэфармацыі. Кнігадрукаванне, якое ўзнікла на хвалі Рэфармацыі, вызначалася высокай удзельнай вагой свецкіх выданняў. У Брэсцкай, Любчанскай, Нясвіжскай друкарнях выдаваліся гістарычныя творы, павучальныя трактаты, пераклады антычных аўтараў, дзеячаў сярэдневяковай культуры і эпохі Адраджэння, юрыдычная, вучэбная і педагагічная літаратура [3]. Рэфармацыйнае кнігадрукаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

садзейнічала пашырэнню жанравай тэматыкі кнігі, працэсу далучэння беларускага грамадства да заходнееўрапейскай культуры. Безумоўна, што для такога погляду на адносіны паміж беларускай і еўрапейскай культурамі і цывілізацыямі была неабходна даволі развітая рэфлексія, якая б дазваляла асэнсоўваць і ацэньваць уласную культуру як цэлае, параўноўваць з іншымі культурамі, выказваць крытычныя меркаванні аб іх і даваць рэкамендацыі наконт іх магчымасці ці неабходнасці адаптацыі. У XVI ст. такая рэфлексія культур і адпаведнае ёй канцэптуальнае мысленне аб культуры мела ўжо месца на беларускіх землях. Так, Сымон Будны ў сваіх прадмовах адстойваў незалежнасць філасофіі ад багаслоўя і рэлігіі, абгрунтоўваў ідэю натуральнай маралі і натуральнага права. Яго філасофска-этычныя погляды рэнесансна-гуманістычныя з выразна акрэсленымі антыцаркоўнымі тэндэнцыямі [1]. Яшчэ больш выразна гэта тэндэнцыя прасочваецца ў грамадска-педагагічнай дзейнасці Казіміра Лышчынскага, аўтара філасофскага трактата «Аб неіснаванні Бога», дзе ён выступаў супраць рэлігійнага светаразумення і хрысціянскай рэлігіі, адмаўляў біблейскую касмагонію, сцвярджаў, што прырода развіваецца па ўласных законах без умяшання звышнатуральнай сілы, а свет існуе вечна. Філосаф адмаўляў бессмяротнасць душы, Тройцы, замагільны свет, уваскрэсенне з мёртвых, крытыкаваў царкоўную мараль, настойваў на замене царкоўнага шлюбу грамадзянскім. Атэіст лічыў, што ўяўленні людзей пра Бога — вынік іх фантазіі і памылак [2]. Шэраг дзеячаў Беларусі імкнуліся актывізаваць міжкультурны дыялог ВКЛ з еўрапейскімі краінамі і Расіяй. Выхадзец з Берасцейшчыны Ілля Капіевіч быў перакананы ў карысці культурнай камунікацыі Усходу і Захаду. Ён вітаў імкненне славянскіх народаў да аб'яднання, называў беларусаў, рускіх і ўкраінцаў «славяна-рускім народам». Гуманіст падкрэсліваў вялікае значэнне рознабаковага навучання. Ім падрыхтавана, перакладзена і выдадзена каля 20 кніг асветніцкага характару па гуманітарных, прыродазнаўчых, тэхнічных і вайсковых галінах ведаў. Ён адзін з першых распрацаваў для ўсходніх славян навуковую тэрміналогію.

У беларускай культуры ў XVIII ст. адбываюцца працэсы акультурацыі, якія былі дэтэрмінаваны ідэалогіяй Асветніцтва. Прыхільнікі гэтай плыні культуры прапаведавалі прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Прадстаўнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай плыні Асветніцтва I. Храптовіч, I. Яленскі, Л. Барановіч, Г. Каніскі, К. Нарбут і інш. звязвалі навуковыя задачы з гуманістычнымі, лічылі свабоду думкі абавязковай умовай для развіцця навукі, што спрыяла ўзнікненню і ўмацаванню шматлікай разнастайнасці свецкіх ведаў, у тым ліку кніжных, якія ўтрымлівалі абагульняючыя звесткі аб мовах, мастацтве і навуках. У духу ідэй Асветніцтва была ажыццёўлена рэформа школ. Адукацыйная камісія, заснаваная сеймам 1773-1775 гг., зрабіла спробу вызваліць адукацыю ад прамога ўплыву каталіцкай царквы. Агульнае кіраўніцтва справай асветы забіралася з рук духавенства, тэалогія была выключана з навучальных праграм. Школа набывала свецкі характар. Асаблівая ўвага надавалася прыродазнаўчым вучэбным дысцыплінам: фізіцы, батаніцы, геаметрыі, мінералогіі, ветэрынарыі, камерцыі, геаграфіі і інш. З гуманітарных навук выкладаліся лацінская і польская граматыкі, гісторыя, заканадаўства і інш. [4], Давесці справу секулярызацыі сістэмы адукацыі камісіі не ўдалося ў сувязі з інкарпарацыяй тэрыторыі ВКЛ Расійскай дзяржавай, дзе секулярызацыя культуры ў выніку пятроўскіх рэформ набыла значны размах, а цікавасць да Захаду, еўрапейскай культуры стала гістарычнай неабходнасцю. Пытаннямі культуры на беларускіх землях было даручана займацца Беларускай навучальнай акрузе з цэнтрам у Віцебску, якая працягвала палітыку вывядзення сістэмы адукацыі з пад уплыву царквы. Праўда, пры гэтым ажыццяўлялася палітыка русіфікацыі.

*Літаратура*


1. *Алексютович, Н. А.* Будный — идеолог гуманизма и реформация в Белоруссии и Литве / Н. А. Алексютович // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии и Литвы. — Минск : Навука і тэхніка, 1962. — 116 с.
2. *Дружыц, В.* Казімір Лышчынскі — беларускі бязбожнік XVII в. / В. Дружыц // Полымя. — 1927. — № 2.
3. *Іванова, Л.* З гісторыі рэфармацыйнага кнігадрукавання ў Беларусі / Л. Іванова // Беларусіка - Albaruthenica. — Мінск, 1998. — Кн. 9.
4. *Савіч, А. А.* Школьная реформа в Польско-Литовском государстве в последней четверти 18-го века / А. А. Савич // Вестник Наркомпроса БССР. — 1922. — № 5-6.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Summary***

*The church has played a significant role in cultural and social life of Belarus for many centuries: in the development of education, music, architecture, in extending books science and literature. Those day's perceptional notions made a syncretic whole in which culture was a faith in some degree and a faith was culture.*

*The transformation of ancient Belarusian and Medieval syncresis which led to a rather branched differentiation of culture and corresponding socio-cultural institutions, the degradation of a unified church and the crisis of an unshakeable faith began in the period of Reformation and was further supported by the ideology of the Enlightenment.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ